пища людей становится пищей духовной (хлеб = Слово Божье), помогая приблизиться к Божественному.

Это лишь некоторые семантические группы названий Божества в Новом Завете. Данный тип классификации выделяет также блоки имен, например, с такими компонентами, как *Агнец, Храм, Посланник, Дверь, Царь, Пророк, Свидетель, Вождь, Свет, Звезда, Солнце.*

## ІДЭЙНА-МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АКТАЎ Н. ГІЛЕВІЧА

***Н. М. Філон** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір. **І. Ф. Штэйнер***
*доктар філал. навук, прафесар*

У беларускай літаратуры паняцце актавы відазменена. Так, у зборніку Н. Гілевіча "Актавы" (1976) пад дадзенай паэтычнай формай падразумяваюцца не толькі класічныя актавы, але і васьмірадковыя вершы рознай рыфмоўкі. Галоўнай асаблівасцю актаў з'яўляецца вобразнае, але адначасова лаканічнае выражэнне аўтарскіх думак, эмоцый, жыццёвай філасофіі паэта. Класічнымі актавамі ў строгім сэнсе гэтага паняцця з'яўляюцца не ўсе вершы: большасць з іх мае перакрыжаваную рыфму. Такім чынам, наследаванне класічнай традыцыі выражаецца ў асноўным у выкарыстанні васьмірадкоўя як формы верша. "Актавы" Н. Гілевіча – "творы пераважна медытацыйнай лірыкі, падказаныя ўстаноўкай на лаканічнае выяўленне роздуму над сутнасцю сучаснага і чалавека" [1, с. 181]. Скразным вобразам, што аб'ядноўвае вершы Н. Гілевіча розных гадоў у адзінае мастацкае цэлае, з'яўляецца вобраз Радзімы.

З пункту гледжання спалучэння класічнай формы і арыгінальнага зместу найбольшую цікавасць выклікае акраверш, прысвечаны каханай жанчыне "Мілая мая" [2, с. 107]. Н. Гілевіч нават у інтымнай лірыцы праяўляе сябе як тонкі сатырык, што складае адну з яскравых асаблівасцей яго паэтычнага таленту. Майстэрства паэта праяўляецца ва ўмелым спалучэнні рознастылёвай лексікі (*рай прынадлівага поўдня – цёплае, як пойла*), стварэнне мастацкай іроніі праз шэраг трапных параўнанняў (*што ў балотцы жабурыння*). Насуперак класічным правілам вершаскладання, якія патрабавалі выкарыстання ў цвёрдых вершаваных формах "высокай" лексікі, паэт смела эксперыментуе. Пры гэтым стылістычная зніжанасць верша не перашкаджае лірычнаму герою выразіць свае пачуцці, а таксама скептычнае стаўленне да курортнага асяроддзя і ўласнай творчасці.

Такім чынам, з пункту погляду выкарыстаных паэтычных сродкаў Н. Гілевіч паўстае як паэт, які актыўна выкарыстоўвае метафары (як класічныя, так і арыгінальна-аўтарскія), уводзіць у паэзію алегарычныя вобразы, антытэзы, выдатна валодае рознымі стылямі беларускай мовы.

**Літаратура**

1 Калеснік, У. Матэрыя пачуцця / У. Калеснік // Маладосць. – 1976. – № 11. – С. 178–182.
2 Гілевіч, Н. Актавы / Н. Гілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 144 с.

## УЗАЕМАСУВЯЗЬ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ І НАВУКОВА-КРЫТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ В. ЛАСТОЎСКАГА

***А. У. Цітоў** (УА «МДУ імя А. А. Куляшова»)*
*Навук. кір. **А. В. Шарапава**,*
*ст. выкладчык*

В. Ю. Ластоўскі сцвердзіў сябе як неардынарны дзяржаўны, палітычны і грамадскі дзеяч нацыянальнага кірунку, арыгінальны навуковец у галіне гісторыі, этнаграфіі,